принять меры по обеспечению возмещения причиненного преступлением ущерба, общей и специальной конфискации.

Практически во всех случаях документы и фактические данные, поступившие из-за рубежа во исполнение международных следственных поручений о розыске и аресте полученных преступным путем средств и имущества, в той или иной процессуальной форме используются в процессе доказывания по уголовным делам на предварительном следствии и в суде.

Однако, как показывает анализ судебной практики, потенциал, заложенный в ходе розыска и ареста за рубежом полученных преступным путем денежных средств и имущества, на судебных стадиях уголовного процесса в полной мере не используется. По подавляющему большинству уголовных дел, денежные средства и имущество, полученные преступным путем и находящиеся за рубежом, по приговору суда не могут быть подвергнуты специальной или общей конфискации и обращены в счет погашения причиненного ущерба в доход государства. По нашему мнению, разработка международной (национальной) методики оценки ущерба от денежных средств и имущества, полученных преступным путем, решила бы ряд вопросов, связанных с организационными, правовыми, информационными и даже политическими аспектами рассматриваемой проблемы.

Не самая последняя роль в этом принадлежит национальным судебным органам, которые могли бы предусмотреть в целях максимального учета при изложении в судебном приговоре, а также в судебном ходатайстве об его исполнении обоснование и решение об обращении в доход государства полученных преступным путем денежных средств и имущества, согласовав требования национального законодательства (в первую очередь уголовно-процессуального) с законодательством иностранного государства (запрашиваемой стороны).

Существенный потенциал в рассматриваемой сфере содержится в дальнейшем развитии взаимодействия между национальными правоохранительными и контрольными органами Республики Беларусь (Департамент финансового мониторинга, Комитет государственного контроля Республики Беларусь, Комитет государственной безопасности) и их зарубежными партнерами и, в том числе, в рамках специальных международных организаций (Группа разработки финансовых мер борьбы с отмыванием денег – Financial Action Task Force of Money Laundering, Группа международных финансовых действий – Groupe d'Action Financiere International и др.).

На наш взгляд, в качестве первоочередных для осуществления глобальной стратегии по борьбе с отмыванием денег и борьбы с транснациональной организованной преступностью можно определить следующие направления международного сотрудничества в борьбе с транснациональной организованной преступностью и легализацией (отмыванием) доходов, полученных преступным путем:



признание отмывания преступных доходов уголовно наказуемым деянием;

ограничение банковской тайны;

применение правила «знай своего клиента»;

выявление подозрительных операций и донесение о них;

совершенствование регулирования деятельности предприятий или профессиональных групп по финансовым операциям.

УДК 351.74 (09)

*А.І. Мурашка, П.А. Капіца*

## АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПРАВАВЫЯ АСНОВЫ ДЗЕЙНАСЦІ АГУЛЬНАЙ ПАЛІЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай на яе тэрыторыі была распаўсюджана расійская юрысдыкцыя. У галіне праваахоўнай дзейнасці на тэрыторы беларускіх губерняў дзейнічалі нормы прававых актаў Расійскай дзяржавы.

Больш цэласная сістэма агульнай паліцыі ў Расійскай імперыі была створана ў часы царавання Кацярыны II. У 1775 г. быў выдадзены прававы акт «Установа для кіравання губернямі Усерасійскай імперыі» (далей – «Установа»). Артыкул 22 гл. 1 дадзенага акта абвяшчаў: «В каждом уезде или округе учреждается Нижний Земский Суд» [1, с. 232]. Гэты орган быў закліканы выконваць на адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках паліцэйскія функцыі. У склад ніжняга земскага суда ўваходзілі: земскі спраўнік (капітан-спраўнік), два або тры дваранскія засядацелі, дакладная колькасць якіх магла вагацца ў залежнасці ад «обширности» павету, сакратар, у загадванні якога знаходзілася канцылярыя, а таксама «заседатели от поселян». Першапачаткова асноўныя чыноўнікі павятовай паліцыі – спраўнік і засядацелі – выбіраліся на тры гады мясцовым дваранствам. Гэтыя пасады былі прыведзены ў адпаведнасць з класамі пятроўскага Табелю аб рангах. Так, пасадзе земскага спраўніка быў прысвоены IX клас, засядацеля – X і сакратара – XIV клас. Чыноўнікі земскай паліцыі былі падпарадкаваны губернскай адміністрацыі на чале з губернатарам. Ніжні земскі суд згод-

на з гл. XVII «Установы» павінен быў забяспечваць выкананне законаў імперыі, выкананне распараджэнняў губернскага кіраўніцтва, судовых рашэнняў, меў і іншыя функцыі па кіраванню паветам, у тым ліку забяспечваў арганізацыю платы падаткаў, выкананне натуральных павіннасцей, наглядаў за парадкам вядзення гандлю ў павеце, станам дарог і інш. [1, с. 251–252]. Зразумела, што такі значны аб'ём функцыянальных абавязкаў не мог адмоўна не адбіцца менавіта на выкананні праваахоўных задач чыноўнікамі ніжніх земскіх судоў.

«Установа» прадугледжвала таксама існаванне чыноў сельскай паліцыі, якія б непасрэдна падтрымлівалі грамадскі парадак на месцах. Ствараліся пасады соцкіх, пяцідзясяцкіх, дзясяцкіх. Гэтыя службовыя асобы выбіраліся з вольных або прыгонных сялян на год і прыносілі прысягу. На працягу тэрміну службы яны мелі права не быць прыцягнутымі да выканання любых гаспадарчых прац, якія б заміналі выкананню імі прамых абавязкаў. На сельскую паліцыю ўскладваўся шэраг разнастайных функцый, як непасрэдна паліцэйскіх, так і гаспадарчых. Аднак пастаўленыя задачы, фактычна, не выконваліся з-за даволі нізкага адукацыйнага ўзроўню сельскіх чыноўнікаў і залежнасці іх ад памешчыкаў [2, с. 22].

Адмысловым чынам арганізоўваліся органы агульнай паліцыі ў гарадах. Згодна з «Установай» 1775 г. у гарадах, дзе не мелася пасады каменданта, прызначаўся гараднічы [1, с. 232]. У 1782 г. Кацярынай II быў выдадзены Статут дабрачынства, або Паліцэйскі. Гэты дакумент быў асноўным прававым актам у сферы функцыянавання органаў аховы правапарадку ў гарадах. Паводле яго ў кожным горадзе ствараліся спецыяльныя паліцэйскія ўстановы – управы дабрачынства, або паліцэйскія. У губернскіх гарадах яны ўзначальваліся паліцмайстарамі, у іншых гарадах – гараднічымі [3, с. 68]. Управа дабрачынства таксама складалася з прыстава крымінальных спраў і прыстава цывільных спраў, якія прызначаліся ў сталіцы Сенатам, у іншых гарадах – губернскім кіраўніцтвам, двух ратманаў, якія выбіраліся з купцоў гарадскім сходам. За паліцыяй гарадоў было замацавана даволі шырокае кола функцыянальных абавязкаў. У прыватнасці, паводле главы «О должности Управы Благочиния» паліцэйскага статута дабрачынства органы паліцыі «долженствовали» сачыць за выкананнем гараджанамі законаў, рашэнняў мясцовай адміністрацыі і пастаноў суда. Акрамя гэтага, управы дабрачынства займаліся пытаннямі гарадскога добраўпарадкавання, санітарыі, пажарнай бяспекі, а таксама парадку вядзення гандлю. Паліцыя праводзіла папярэдняе следства і судзіла за дробныя крадзяжы і махлярства. У мэтах павышэння эфектыўнасці паліцэйска-кіраўніцкай дзейнасці паводле Статута дабрачынства губернскія, а таксама іншыя



найбольш буйныя гарады падзяляліся на часткі па 200–700 двароў. За кожнай часткай замацоўваліся часткавыя прыставы, якія мелі звычайна ў падпарадкаванні адмысловыя канцылярыі. Часткі падзяляліся на кварталы па 50–100 двароў. Тыя ж невялікія па памерах гарады, якія складаліся са 100–200 двароў, на часткі не падзяляліся, а маглі ўключаць у сябе толькі кварталы. Кварталамі загадвалі квартальныя наглядчыкі. Гэтым службовым асобам падпарадкоўваліся квартальныя паручнікі, якія выбіраліся гараджанамі на тры гады «из посторонних чиновых людей» без «явного порока» [4, с. 463]. Ніжэйшым выканаўчым звяном у сістэме праваахоўных органаў горада былі паліцэйскія-будачнікі, якія сачылі за парадкам на гарадскіх вуліцах і плошчах [3, с. 68]. Варта адзначыць, што гарадская паліцыя да сярэдзіны XIX ст. у асноўным дзейнічала ў парадку, усталяваным у 1782 г.

У 1837 г. была праведзена рэарганізацыя ніжніх земскіх судоў. Палажэнне аб земскай паліцыі, прынятае ў гэтым годзе, замацоўвала новую структуру земскай паліцыі. Паводле палажэння павет стаў падзяляцца на пэўныя ўчасткі – станы на чале са станавым прыставам. Дадаткова стваралася пасада старэйшага «непременного» засядацеля. Пры земскім судзе знаходзіліся таксама два сельскія засядацелі, якія займаліся справамі, звязанымі з дзяржаўнымі сялянамі і іх маёмасцю. Згодна з палажэннем спраўнік, старшы і сельскія засядацелі павінны былі пастаянна знаходзіцца ў павятовым цэнтры, а ўчастковыя засядацелі (станавыя прыставы) – на тэрыторыі падначаленых ім участкаў [5, с. 463–464]. Павышаліся клас асноўных павятовых паліцэйскіх пасад і грашовае ўтрыманне павятовых чыноўнікаў паліцыі.

Такім чынам, у Расійскай імперыі на працягу XVIII – першай паловы XIX ст. склалася пэўная сістэма органаў аховы правапарадку, якая складалася з ніжніх земскіх судоў у паветах і ўпраў дабрачынства ў гарадах. Гэтыя органы былі закліканы не толькі ахоўваць правапарадак і змагацца са злачыннасцю, але і выконваць мноства іншых функцый, часам зусім не звязаных з праваахоўнай дзейнасцю.


1. Полное собрание законов Российской Империи : собр. 1-е. : в 45 т. СПб. : Тип. Второго отделения собств. Е.И.В. канцелярии, 1830. Т. 20 : 1775–1780. 1041 с.

2. Красильников С.В. Сельская полиция и ее место в системе органов местного самоуправления во второй половине XVIII в. // История государства и права. 2009. № 2. С. 22–26.

3. Мулукаев Р.С. Полиция и тюремные учреждения дореволюционной России // Мулукаев Р.С. Избранные труды : К 80-летию со дня рождения / Акад. упр. МВД России. М., 2009. С. 62–86.

4. Полное собрание законов Российской Империи : собр. 1-е. : в 45 т. СПб. : Тип. Второго отделения собств. Е.И.В. канцелярии, 1830. Т. 21 : 1781–1783. 1070 с.

5. Полное собрание законов Российской Империи : собр 2-е. : в 55 т. СПб. : Тип. Второго отделения собств. Е.И.В. канцелярии, 1830–1884. Т. 12, отделение 1 : 1837–1838. 822 с.